***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт*
***Ж. Я. Белакурская,***
*кандыдат філалагічных навук*

# ЭТНІЧНЫ ХАРАКТАР І МОЎНАЯ СВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

На сучасным этапе ўсё больш часта заяўляюць пра сябе этнічныя канфлікты як сведчанне важнасці нацыянальных каранёў, што заўсёды ўсведамлялася лепшымі прадстаўнікамі кожнага народа. «Кожны народ не без племені-роду», – пісаў выдатны паэт беларускага Адраджэння М. Гусоўскі. Па-за нацыянальнасцю, якая разумеецца як індывідуальнае быццё, паводле М. Бярдзяева, немагчыма існаванне чалавецтва. Менавіта праз нацыянальную адметнасць кожны асобны чалавек уваходзіць у чалавецтва як нацыянальны чалавек.

Вядома, што адзінства таго ці іншага соцыуму выпрацоўвалася гістарычна, на працягу многіх пакаленняў, у барацьбе з прыроднай стыхіяй і заваёўнікамі-чужаземцамі, у кантэксце стварэння каштоўнасцей роднай культуры і фарміравання этнакультурнай ідэнтычнасці.

Абавязак кожнага этнасу – самапазнанне. Вынікам такога самапазнання можа з’явіцца больш дакладнае ўяўленне аб сваім нацыянальным характары і высвятленне гістарычнай перспектывы свайго народа ў святле сучасных выклікаў і адказаў на іх.

На пачатку ХХ ст. у царскай Расіі беларусы, нягледзячы на тое, што яны адмяжоўвалі сябе як этнас, усё ж аказаліся дрэнна кансалідаваным насельніцтвам Паўднёва-Заходняга краю. Пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. і пэўнай лібералізацыі этнічнага жыцця ў імперыі, у тым ліку ў сферы нацыянальных адносін, у Беларусі не было, аднак, ніводнай дазволенай уладамі беларускамоўнай школы. Што датычыць вышэйшай адукацыі, то яна была магчымай толькі па-за межамі роднага краю. Гэта садзейнічала дэнацыяналізацыі беларускай інтэлігенцыі і чыноўніцтва. Адсутнасць універсітэтаў як цэнтраў сістэмнай падрыхтоўкі высокапрафесійных нацыянальных кадраў для матэрыяльнай інфраструктуры і духоўнага жыцця краю мела мноства адмоўных вынікаў, у тым ліку паскарэнне дэнацыяналізацыі беларускага грамадства ў цэлым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дадатковым фактарам русіфікацыі стала і блізкая роднасць беларускай і рускай моў. Ад «няпоўнавартасці» роднай мовы дэнацыяналізаваныя індывіды пазбаўляліся шляхам асабістага далучэння да кніжна-пісьмовай культуры тытульнай нацыі.

Як вядома, тэзіс аб вывучэнні культуры народа стаў ужо аксіяматычным. Зварот да роднай культуры, у тым ліку і моўнай, разглядаецца як найважнейшы крок на шляху асэнсавання асаблівасцей мыслення народа, яго этнічнага характару і духоўнага вопыту. Нацыянальная мова – гэта аснова культуры і самаідэнтыфікацыі народа, што пацвярджаецца вядомымі радкамі Ф. Багушэвіча: «Не пакідайце ж мовы нашай, беларускай, каб не ўмёрлі!»

Стагоддзі знаходжання беларускага народа ў складзе Расійскай імперыі значна перашкодзілі развіццю беларускай мовы, не даючы ёй належнай магчымасці заявіць пра сябе ў розных галінах – адукацыі, навуцы, палітыцы, прафесійнай мастацкай культуры.

На пачатку XX ст. у Беларусі ўзнялася новая хваля нацыянальнага Адраджэння, што садзейнічала стварэнню інстытуцыйных асноў для развіцця роднай мовы. Сапраўднай энцыклапедыяй беларусазнаўства з’явілася праца Я. Карскага «Белорусы» (1921), якую вучоны распачаў яшчэ да рэвалюцыі 1917 г. Аднак у другой палове 20-х гг. гэты працэс уладамі быў жорстка перапынены. Дастаткова шырокае распаўсюджанне атрымала на той час меркаванне аб беларускай культуры як «рэакцыйна-феадальнай» (XV–XVI стст.) ці буржуазна-нацыяналістычнай (канец XIX – пачатак XX ст.). Рэпрэсіі беларускай інтэлігенцыі ў 30-я гг. сталі апошняй кропкай.

Пасля распаду СССР Рэспубліка Беларусь, як і раней, аказалася ў адзінай інфармацыйнай (і ў значнай ступені – моўнай) прасторы з Расіяй. Акрамя пазітыўных момантаў, дадзенае становішча спрыяла таму, што ў пэўнай частцы беларусаў усталёўвалася недастатковае ўсведамленне сваёй ідэнтычнасці і самабытнасці сваёй культуры. Спрыяла такому погляду і схільнасць беларускіх палітыкаў разглядаць беларусаў і рускіх як адзін народ.

Згодна з данымі сучасных даследаванняў навукоўцаў і паводле апошняга перапісу насельніцтва, большасць жыхароў Беларусі размаўляюць на рускай мове, але 73,7% усяго насельніцтва краіны, у тым ліку 85,6% беларусаў, лічаць беларускую мову роднай. «Гэта азначае, што ў сучаснай Беларусі этнічнае і моўнае самавызначэнне грамадзян адбываецца на нацыянальна-дзяржаўнай аснове: такой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паўстае свядомасць людзей, рэаліі іх адносін да сваёй краіны» [2, с. 81].

Такім чынам, гэта сведчыць аб тым, што працэс самаідэнтыфікацыі аб’ектыўна пашыраецца ў беларускім грамадстве, закранаючы знешнія, вонкавыя моманты. Таму галоўная праблема – праблема мовы як «дома жыцця» («дома бытия») [3, с. 191], пакуль знаходзіцца далёка ад свайго сістэмнага вырашэння.

1. *Бердяев, Н. А.* Истоки и смысл русского коммунизма / Н. А. Бердяев. – М. : Наука, 1990. – 234 с.

2. *Мячкоўская, Н. Б.* Мовы і культура Беларусі: нарысы / Н. Б. Мячкоўская. – Мінск : Права і эканоміка, 2008. – 346 с.

3. *Хайдеггер, М.* Письмо о гуманизме / М. Хайдеггер ; пер. В. В. Бибихина // Бытие и время / М. Хадеггер – М. : Республика, 1993. – 447 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ